В ближайшем будущем, вполне возможно, что онлайн-сервисы вытеснят с туристического рынка традиционные компании, которые по сравнению с ними будут являться негибкими и устаревающими. В итоге конкурентное преимущество получат те компании, которые уже сейчас смогут перейти в сферу информационных технологий и хорошо зарекомендовать себя в этой сфере.


1. Лисенкова, А. А. Вызовы и возможности цифровой эпохи: социокультурный аспект // Российский гуманитарный журнал. – 2018. – Т. 7. – № 3. – С. 217–222.

2.Россия онлайн? Нельзя догнать отстать [Электронный ресурс] / Б. Банке [и др.]. – Режим доступа: http://russiaonline.info/story/digitalization-impact.

3. Цифровизация туризма: кто не успел, тот опоздал [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.tourprom.ru/articles/42/.

4. Сеть туристических бюро «Мой горящий тур» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://moihottur.ru/search/.

5. Захарцев, С. И. Убыстрение темпа жизни как новая философская проблема [Электронный ресурс] / С. И. Захарцев, В. П. Сальников, А. В. Чумаков. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/v/ubystrenietempa-zhizni-kak-novaya-fi losofskaya-problema.



***Булаты П.Ю.,*** канд. гіст. навук
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры


## ЗНАЧЭННЕ ТУРЫЗМУ Ў ЖЫЦЦІ ЧАЛАВЕКА: ПОГЛЯД З МІНУЛАГА


***Bulaty P.***
Belarusian State University of Physical Culture


## THE IMPORTANCE OF TOURISM IN HUMAN LIFE: A VIEW FROM THE PAST


АНАТАЦЫЯ. Артыкул прысвечаны развагам пра ролю індустрыі турызму, значэнне вандровак для сталага пакалення і моладзі, якія былі сфармуляваныя ў міжваенны час. Увага звяртаецца на важнасць гістарычнай пераемнасці ў развіцці сучаснай індустрыі турызму.



КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: гісторыя турызму; турызм; выхаванне; гістарычная пераемнасць; вандроўкі.



ABSTRACT. The article is devoted to reflections on the role of the tourism industry, the importance of travel for the mature generation and youth, which were formulated in the interwar period. Attention is drawn to the importance of historical continuity in the development of the modern tourism industry.



KEYWORDS: history of tourism; tourism; upbringing; historical continuity; travels.


Важнай задачай у працэсе развіцця сучаснай індустрыі турызму з’яўляецца захаванне гістарычнай пераемнасці з напрацоўкамі, якія былі назапашаныя ў мінулыя эпохі. Як галіна гаспадаркі індустрыя турызму на беларускіх землях развіваецца ўжо

больш за стагоддзе. Натуральна, што за гэты час было створана шмат турыстычных прадуктаў, назапашана шмат карысных ведаў для развіцця індустрыі. Нароўні з відавочнасцю тэарэтычнага тэзіса аб важнасці напрацовак мінулага, мае месца практычны разрыў у повязі з дасягненнямі папярэднікаў. Аб'ектыўна сітуацыю «узаемадзеяння» пакаленняў можна сфармуляваць кароткім выказваннем: кожнае новае пакаленне стварае індустрыю турызму нанова. У сувязі з гэтым актуальным напрамкам даследавання з'яўляецца зварот да турыстычных ведаў, назапашаных папярэднікамі. Пры гэтым значэнне маюць не толькі практычныя напрацоўкі (турыстычныя і экскурсійныя маршруты, спосабы прасоўвання прадукту на рынак і г. д.), але і тэарэтычныя развагі: яны – падмурак практычнай дзейнасці.

У прадстаўленым даследаванні мы звярнуліся да публіцыстычных матэрыялаў, якія былі апублікаваныя ў 1935 г. на старонках выдання «У Наваградскім краі» («W Nowogródzkiej Stronie»). Гэта інфармацыйна-турыстычны бюлетэнь міжваеннага часу, які выходзіў у Наваградскім ваяводстве і быў прысвечаны турыстычнай дзейнасці ў гэтым рэгіёне. У №4 (май 1935 г.) бюлетэня змешчаны артыкул «Значэнне вандровак для старэйшых і моладзі» аўтарства Ядвігі Бабровіч (1896–1942; настаўніца мовы, гісторыі і геаграфіі з Баранавіч і Стоўбцаў, загінула падчас нацысцкай акупацыі ў лагеры смерці Калдычова). У адзначаным артыкуле распавядаецца і раскрываецца значэнне вандровак і падарожжаў. Акцэнт робіцца на карысці падарожжаў для старэйшага пакалення. Большая ўвага звяртаецца на карысць вандровак для моладзі: іх адукацыйнае і выхаваўчае значэнне. Паведамляюцца аспекты падрыхтоўкі да вучнёўскага падарожжа, неабходнай экіпіроўкі.

На нашу думку, прыведзеныя ў артыкуле тэзісы і развагі адносна вандровак і турызму не страцілі актуальнасці і ў наш час, будуць карысныя для развіцця сучаснай беларускай індустрыі турызму. Публіцыстычны матэрыял намі быў выяўлены, перакладзены з польскай мовы і ў поўным аб'ёме падрыхтаваны да друку (з каментарыямі) у практыкуме «"У Наваградскім краі": матэрыялы турыстычнай публіцыстыкі». Прыводзім вытрымкі з артыкула, якія бачацца нам найбольш важнымі і актуальнымі:

«Сёння мы жывём пад дэвізам адраджэння і амаладжэння. Чалавецтва, здаецца, хоча пайсці па слядах Маці-прыроды, якая, дзякуючы сваім змяненнем, скідвае з сябе старую абалонку і разам з вясновымі промнямі сонца бярэ новы ўбор. Мэта жыцця сучаснага чалавека – падоўжыць сваё існаванне. Хочам жыць доўга, прагнем захаваць сваю маладосць, здароўе і сілы. З гэтай мэтай шукаем розныя сродкі, якія б маглі перадухіліць страту фізічных і духоўных сіл.

Яшчэ старажытныя алхімікі шукалі лек ад старасці… сучаснасць таксама прапануе свае сродкі: ці то ў выглядзе лекаў, ці то накшталт касметычных ці цырульніцкіх працэдур; альбо свабоднага гігіенічнага строю, а таксама самых розных спартыўных практыкаванняў, гімнастыкі і таму падобнае. Маюць яны адну мэту – умацаваць здароўе і даць камфорт нашаму целу, уплываць на добрае самаадчуванне, радасць і разуменне значэння жыцця.

Адным з найважнейшых чыннікаў адраджэння і амаладжэння чалавека з'яўляюцца вандроўкі.

Дом, бліжэйшае атачэнне, мясцовасць, у якой стала прыбываем – прастора звыш цесная, сумная і мёртвая для таго, каб яна магла нас пазнаёміць з лепшымі ўмовамі жыцця, развіць усебакова наш характар, пабудзіць да жывога рэагавання на з'явы

прыроды і творы мастацтва. Цяпер можна зразумець сучасны турыстычны рух, які агарнуў увесь культурны свет, не зважаючы на ўзрост, пол, стан заможнасці. Яго значэнне каштоўнае ў фізічным і маральным плане. Найперш, вандроўкі аказваюць станоўчы ўплыў на наша здароўе. Хоць бы пешшу, хоць бы на вёслах, лыжах ці на ровары, мы добра ўплываем на наша цела і ўнутраныя органы – сэрца і лёгкія, мы паляпшаем нашу фізічную форму. Ёсць цяпер розныя формы рухомасці – больш ці менш актыўныя, якія развіваюць так зараз неабходную ў жыцці чалавека вытрымку.

Навуковае значэнне вандровак вядомае здаўна. Усе вядомыя батанікі, географы, мовазнаўцы, мастакі ўзбагачалі свае веды вандроўкамі, тым самым павысілі іх вартасць для навукі.

Калі абмяркоўваць маральныя якасці, якія выпрацоўваюцца падчас паездак, то галоўным чынам развіваюцца: настойлівасць, мужнасць, наяўнасць жывога розуму, звыкласць да патрэб, здольнасць абыходзіцца малым, салідарнасць у калектыўным жыцці і дысцыпліна.

Калі большасць акрэсленых каштоўнасцей ад вандровак знаходзіць сабе прыхільнікаў сярод старэйшага пакалення грамадства, тым больш мы павінны імкнуцца да таго, каб наша моладзь прымала ў іх найбольш яскравы і шматлікі ўдзел, таму што вандроўкі ўтрымліваюць выхаваўчы фактар самай высокай значнасці. Школа, якая хоча пазнаёміць сваіх вучняў з жыццём, павінна вывесці іх за свае сцэны, расказаць пра прыгажосць і багацце краіны, пра сродкі працы, пазнаёміць з разнастайнасцю і праявамі чалавечага жыцця – адным словам, змяніць тэорыю на практыку паказ рэчаіснасці ва ўсёй паўнаце, якой патрабуе жыццё.

Нельга казаць пра знаёмства з уласнай культурай, калі не ведаеш сваёй зямлі!

Перавагі вандровак для моладзі носяць разнародны характар.

У першую чаргу вандроўкі забяспечваюць удзельнікаў фізічным здароўем, лечаць нервовасць, развіваюць назіральныя якасці, навучаюць глядзець на свет, каб зразумець яго, любіць сваю зямлю і праз яе больш глыбокае пазнанне пранікаць у чалавечыя пытанні; гэты спосаб пастулова падрыхтоўвае будучага грамадзяніна. Моладзь лепей пазнаёміцца з умовамі побыту ў дзяржаве, калі зразумее асновы гаспадарчага развіцця.

Акрамя таго, паездкі фармуюць пачуццё нацыянальнага гонару, узаемнага разумення [...].

Аднак важна пазнаёміць моладзь з уласным краем не толькі з пункту гледжання «матэрыялу». Трэба навучыць яе адчуваць сябе ў прыгожым пейзажы, слухаць і разумець яго мову… Тады толькі родная прырода прамовіць да дзіцячай душы і абудзіць самыя высакародныя пачуцці, якія перш за ўсё будуць выяўляць сябе ў імкненні да захавання цудоўнай гармоніі і аховы прыроды і твораў мастацкай спадчыны ад разбурэння.

Пераадоленне перашкод падчас падарожжа развівае дзяцей, гартуе іх дух і праведнасць, жыццё на тле прыроды развівае салідарнасць, таварыскасць і пачуццё дысцыпліны. Акрамя таго, настаўнікі-выхавацелі маюць магчымасць пастаянна быць на сувязі з моладдзю, пазнаёміцца з яе характарам, норавам і зрабіць адпаведны ўплыў на яе паводзіны і калектыўныя звычкі.

Цяпер на хвілінку засяродзімся над тым, як вандроўцы набыць выхаваўчае значэнне, аб якім казалася вышэй? Адказ толькі адзін: калі яна будзе добра падрыхтавана і належным чынам, якасна праведзеная […].

Пасля належнай падрыхтоўкі да выезду надыходзіць іншы момант – спраўнае правядзенне падарожжа. Тут трэба такія якасці, як пунктуальнасць і дысцыпліна, якая абавязвае ўсіх удзельнікаў вандроўкі, роўнасць і салідарнасць. Усе гэтыя фактары абавязковыя ў падарожным жыцці, але асабліва трэба звярнуць увагу на роўнае абыходжанне з усімі падарожнікамі. Меней ці болей прыемныя рэчы, камфорт альбо дыскамфорт мусіць быць аднолькава перанесены ўсімі ўдзельнікамі вандроўкі, бо гэта дасканала загартоўвае моладзь, іх самастойнасць, знаходлівасць і мэтанакіраванасць […].

Калі казаць аб атрыманні навуковага ці выхаваўчага плёну ад падарожжа, то, як гаварылася вышэй, сама добра арганізаваная вандроўка, таварыства і супольная справа дадуць шмат выхаваўчых момантаў. Наступнае наведванне новых асяродкаў, пазнанне іншых людзей павінна так паўплываць на моладзь, каб яна займела крытычны погляд на розныя з'явы, умела адрозніваць добрае ад злога, паважаць і шанаваць чалавечую працу, развіваць у сабе перакананне аб значэнні кожнай асобы ў грамадстве, якая выконвае важныя функцыі ў жыцці дзяржавы.

Калі такім чынам маладыя людзі прыстасуюцца да сустрэтых з'яў і людзей, калі ў іх абудзіцца жаданне працягваць і ўдасканальваць працу на карысць чалавецтва – тады вялікая выхаваўчая задача паездак і падарожжаў будзе цалкам выканана […].

Рэзюмуючы ўсё вышэйсказанае, трэба падкрэсліць, што вандроўкі і падарожжы – адны з найважнейшых фактараў аднаўлення і амаладжэння чалавека, для моладзі – гэта ідэальная выхаваўчая школа, калі вандроўкі пакінуць моцны і трывалы след у яе думках і... сэрцах» [1].

Такім чынам, з прыведзенага тэксту, апублікаванага яшчэ ў 1935 г., можна вынесці актуальныя канструкцыя, якія будуць карысныя для функцыянавання сучаснай індустрыі турызму:

1) у публіцыстычным матэрыяле сцвярджаецца, што адным з найважнейшых чыннікаў адраджэння і амаладжэння чалавека з'яўляюцца вандроўкі. Гэта выдатны прыклад рэкламнага слогану для папулярызацыі сучаснага турызму як з'явы;

2) у матэрыяле акрэсліваецца формула якасці турыстычнай паслугі: добрая падрыхтоўка і належная арганізацыя;

3) значная частка прысвечана аспектам выхаваўчай працы з моладдзю. Дадзены досвед мае практычнае значэнне і можа быць прыменены ў сучаснай выхаваўчай працы сярод моладзі і студэнтаў.

1. Bobrowiczowa, J. Znaczenie wycieczek dla starszych i młodzieży / J. Bobrowiczowa // W Nowogródzkiej Stronie. – 1935. – №4. – S. 2–3.